*Любоў Сівурава*

# ЭВАЛЮЦЫЯ СВЕТАПОГЛЯДУ БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСТВА У ПРАЦЭСЕ ЗАНЯТКАЎ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯЙ *(XX – пачатак XXI ст.)*

Традыцыйны светапогляд з’яўляецца рэгулятарам практычнай дзейнасці па доглядзе і ўтрыманні свойскай жывёлы. Ён прадстаўляе сабой дынамічную сістэму, якая пастаянна эвалюцыянуе. Каб высветліць характар змен у способах жыцця і дзейнасці сельскага насельніцтва Беларусі, важна паказаць эвалюцыю традыцыйнага светапогляду на працягу XX – пачатку XXI ст. Важнасць яго даследавання абумоўлена грамадскім інтарэсам да праблем экалогіі, сацыяльна-культурнага развіцця, гістарычнай і этнакультурнай спадчыны. Значнасць гэтых працэсаў падкрэсліваецца ў Дзяржаўнай праграме ўстойлівага развіцця вёскі на 2011–2015 гады, Дзяржаўнай праграме развіцця і падтрымкі ўласных дапаможных гаспадарак грамадзян на 2011–2015 гады і іншых дакументах. У планах і адраджэнне авечкагадоўлі ў краіне [8].

У развіцці ўласных дапаможных гаспадарак відавочнымі застаюцца негатыўныя тэндэнцыі. Так, за апошнія 15 гадоў колькасць надворнага статка скарацілася амаль у 3 разы. 66% сялянскіх домаўладанняў не ўтрымліваюць жывёлу [3]. Аб’ектыўнымі прычынамі гэтага спаду называюць скарачэнне колькасці сельскіх жыхароў, старэнне сялян, нежаданне моладзі весці падсобную гаспадарку [2]. Можна меркаваць, што гэтыя факты выкліканы тым, што доўгі час слаба заахвочвалася прыватнаўласніцкая жывёлагадоўля.

Уплыў на развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці зрабілі не толькі сацыяльна-эканамічныя, але і сацыяльна-дэмаграфічныя, сацыяльна-псіхалагічныя і іншыя фактары. У беларускім соцыуме на працягу XX і ў пачатку XXI ст. мяняецца сялянская псіхалогія, адбываецца разрыў міжпакаленных сувязяў у працэсе пераемнасці этнакультурных традыцый, выходзяць з ужытку рацыянальныя веды, уменні і навыкі догляду і ўтрымання свойскай жывёлы, страчваюцца іншыя сакрэты гаспадарчага майстэрства.

Уклад жыцця і светапогляд вясковых жыхароў захоўваўся практычна ў нязменным выглядзе да пачатку XX стагоддзя. Перадача мастацка-культурнага вопыту, ведаў, уменняў, навыкаў гаспадарання адбывалася кантактным шляхам у працэсе міжпакаленнай трансмісіі (дэманстрацыйная антрапатэхніка). У этнаграфічнай літаратуры засведчана, што светапогляд беларускіх сялян да пачатку XX ст. захоўваў міфалагічныя рысы. Вобразы свойскіх жывёл у карціне свету беларусаў адлюстроўваюць міфалагічныя ўласцівасці традыцыйнага светапогляду, дзе прысутнічаюць антрапамарфічныя, анімістычныя і татэмістычныя вераванні, метамарфізм, гомамарфізм. Па шкале падзелу архаічнай карціны свету на восі «прырода – культура» свойскія жывёлы належаць да культурнай, замкнёнай, сацыялізаванай чалавекам прасторы. Яны знаходзяцца ў супрацьлегласці з хаатычна арганізаванай прыроднай сферай і асацыіруюцца з сіламі дабра, парадкам. У сістэме традыцыйнага светапогляду беларусаў свойскія жывёлы ўключаны ў семантычныя шэрагі: «конь» – «сонца» – «золата» – «верх» – «мужчынскі пачатак» – «стыхія паветра» або агню; «карова» – «зямля» – «жаночы пачатак»; «свіння» – «ніз» – «зямля»; «ягня» – «дзіця» і г.д.

Дачыненне «чалавек – свойская жывёла» з’яўляецца неад’емным элементам сістэмы «чалавек – прырода – соцыум». Наяўнасць, колькасць, стаўленне да свойскіх жывёл было паказчыкам статусных характарыстык сяляніна-працаўніка. Свойскія жывёлы з’яўляліся ўласнасцю сялянскай сям’і. У працэсе догляду свойскай жывёлы бралі ўдзел усе члены сям’і, і прыбытак ад гаспадарчай дзейнасці спажываўся ўсімі яе членамі. Існаваў падзел на мужчынскія, жаночыя і дзіцячыя абавязкі. У свядомасці беларусаў адлюстраваны прынцыпы: экалагічнай раўнавагі, упісанасць у прыродна-экалагічную сістэму, які праяўляецца праз гарманічныя суадносіны і ўзаемазалежнасці з акаляючым прыродным асяроддзем; прынцып каляндарнай прадвызначасці парадку вядзення жывёлагадоўчай гаспадаркі, падпарадкаванасць жывёлагадоўчай практыкі прыродна-біялагічным цыклам; прынцып калектыўнасці і ўзаемадапамогі (калектыўны выпас, гноевая талака, калектыўнае абворванне паселішча пры небяспецы эпізоотый і інш.).

Гаспадарча-культурны ўклад жыцця жыхароў беларускіх вёсак пачаў змяняцца пад уплывам сацыяльна-палітычных працэсаў XX ст. Змены светапогляднай парадыгмы былі адчувальнымі ўжо ў 20–30 гады XX ст. Тым не менш рэлігійна-міфалагічныя ўяўленні захоўваліся ў народзе і асабліва ўстойлівымі яны былі ў сялянскай гаспадарцы. Калектывізацыя, якая распачалася ў 1927–1928 гады, суправаджалася абагульненнем свойскай жывёлы і змяншэннем яе колькасці ў прыватным сектары. «Вялікі ўдар па развіцці жывёлагадоўлі нанесла палітыка раскулачвання сялян…Их уласнасць была канфіскавана і перададзена ў калгасы. Так, да канца 1930 г. было раскулачана 15629 сялянскіх гаспадарак» [3, с. 156–157]. У выніку стварэння сельскагаспадарчых кааператываў, а затым жывёлагадоўчых комплексаў, пераходу ад аднаасобнай да калектыўнай гаспадаркі адбылося змяненне ўнутранай структуры жывёлагадоўлі. У перадваенны час катастрафічна звузіліся аб’ёмы валагадоўлі, а ў 50-я гг. XX ст. адбылося яе поўнае згортванне. З развіццём вырабу сінтэтычных валокан, міждзяржаўнага гандлю знікла неабходнасць у авечкагадоўлі.

Дынаміка сацыяльна-культурных, эканамічных і палітычных змен яшчэ больш паскорылася ў другой палове XX ст. Развіццё сельскіх паселішчаў адбывалася па гарадскому тыпу. Пераважала пабудова шматпавярховых жылых будынкаў, дзе адсутнічалі памяшканні для ўтрымання свойскіх жывёл і інш. У 60 – 90-я гады XX ст. назіраецца эвалюцыя традыцыйнага светапогляду ў напрамку дэміфалагізацыі, дэсакралізацыі. З 60-х гадоў XX ст. на фарміраванне новых рыс у традыцыйнай свядомасці актыўна ўплывалі сусветныя геапалітычныя працэсы. Яны яшчэ больш паскорыліся ў выніку глабалізацыі, стварэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адзінай інфармацыйнай прасторы, развіцця апасродкаваных (пісьмовага, тэхналагізаваных) спосабаў камунікацыі. Усё гэта прывяло да адмаўлення большай часткай насельніцтва Беларусі традыцыйных нацыянальных каштоўнасцяў, мовы, уласцівых менталітэту вясковага жыхара, якія ў маргіналаў атаясамліваюцца з цяжкай сялянскай працай (адмаўленне мінулага паводле М. Мід) [5, с. 24]. У выніку рэзкіх гаспадарча-эканамічных і сацыяльна-культурных пераўтварэнняў ХХ Ї пачатку ХХІ ст. была парушана ўстойлівая этнакультурная традыцыя, якая накладала адбітак на побытавы ўклад, гаспадарчую дзейнасць, спосабы і прыёмы апрацоўкі зямлі, вядзенне жывёлагадоўчай гаспадаркі, што знайшло выражэнне ў масавай свядомасці і светапоглядзе.

Каб прасачыць эвалюцыю традыцыйнага светапогляду ў жывёлагадоўчай дзейнасці беларусаў у 2010-2012 гг. аўтарам было праведзена этнасацыялагічнае даследаванне. Яго вынікі паказалі, што жанчыны старэйшага пакалення ведаюць забароны і перасцярогі міжкаляднага часу. Яны пазначылі, што ў гэты перыяд «нельга шыць, бо жывёлы могуць нарадзіцца з калецтвамі», «нельга пазычаць, бо карова пацяраіць малако» (Лепельскі раён), «жывёла звядзецца», «нельга працаваць, бо цяжарная жывёла можа дрэнна цяліцца», «нельга секчы сякерай, бо жывёла можа нарадзіцца з укарочанай нагой» (Ушацкі раён) [1, с. 25].

Да сённяшняга дня не страціла сваёй актуальнасці купальская абраднасць. Рэспандэнты маюць сталае ўяўленне аб тым, чым карысна і чым небяспечна для свойскай жывёлы купальскае свята. Палова апытаных ведаюць, што «купальская раса дае здароўе, прыбаўляе малако», «многа карысці ў купальскіх травах». Іншыя мяркуюць, што чараўнікі ў гэты дзень могуць пашкодзіць жывёле, адабраць малако. Старэйшыя людзі выконваюць засцерагальныя дзеянні ў дачыненні да свойскай жывёлы. На Падзвінні падчас Купалля ў варотах хлява кладуць крапіву і іншыя травы, што адпуджваюць чараўнікоў, абсыпаюць асвечанымі ў царкве макам, соллю, кажуць замовы, малітвы, абносяць грамнічнай свечкай, abліваюць нагаворанай вадой, вешаюць на шыю пас, накладаюць на рогі вянок [1, с. 26].

Значныя змены ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў сталі заўважацца ў апошняй чвэрці ХХ – пачатку ХХІ ст., што пацвярджаюць вынікі даследавання. У жывёлагадоўчай дзейнасці выкарыстоўваецца рытуальна-магічная практыка, хаця сфера яе прымянення ад пакалення да пакалення звужаецца. Магічнымі прыёмамі жывёлагадоўчай дзейнасці валодаюць прадстаўнікі старэйшага пакалення (60–85-ці гадовага ўзросту). Яны захавалі некаторыя веды аб прыкметах дзетародных якасцяў свойскай жывёлы. Імі праводзяцца каляндарныя і аказіяльныя абрады. У купальскім, юр’еўскім абрадах выкарыстоўваюцца засцерагальныя дзеянні ад чараўнікоў. Існуе табуіраванне дзеянняў у дачыненні да прыплоду свойскай жывёлы ў міжкалядны час і г.д. Найбольш устойлівым з’яўляецца ўяўленне аб сурочлівасці свойскай жывёлы. У пачатку ХХІ ст. не ажыццяўляюцца прадуцыравальныя абрады ў дачыненні да свойскай жывёлы. У сувязі з развіццём сеткі ветэрынарных служб страчваюць значэнне веды па этнаветэрынарыі.

Вынікі даследавання паказваюць, што беларусы паступова адасабляюцца ад жывёлагадоўлі. Так, маладыя людзі ва ўзросце да 30 гадоў адказалі на пытанне «Колькі свойскіх жывёл і якіх відаў у Вашай гаспадарцы зараз?» наступным чынам: 60% апытаных не маюць кароў, 100% — цялят, 40% — свіней, 80% — парасят. Ні ў кога няма авечак, ягнят, коз, быкоў-вытворнікаў. 80% рэспандэнтаў не маюць намеру набываць ці павялічыць статак жывёлы. Паводле статыстычных звестак «колькасць асабістых дапаможных гаспадарак грамадзян у Беларусі мае тэндэнцыю да скарачэння. Гэта звязана з малымі прыбыткамі насельніцтва і высокімі выдаткамі на вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі, асабліва жывёлагадоўлі» [7].

60–80% маладых людзей не маюць звестак пра абрадавыя дзеянні падчас першага выгану жывёлы. Толькі 20% апытаных маладых да 30 гадоў ведаюць забароны і перасцярогі міжкаляднага часу, што напалову меней у параўнанні з рэспандэнтамі ва ўзросце 50 і болей гадоў (43–46%). Прыкладна палова апытаных усіх узростаў прытрымліваецца перасцярог у дачыненні да свойскай жывёлы падчас Купалля [17, с. 30]. Беларускія сяляне да гэтага часу праводзяць каляндарныя і аказіяльныя абрады. У купальскім, юр’еўскім абрадах ажыццяўляюцца засцерагальныя дзеянні ад чараўнікоў. Дзеянні ў дачыненні да прыплоду свойскай жывёлы табуіруюцца падчас вялікіх «гадавых» свят і ў міжкалядны час.

Такім чынам, у эвалюцыі традыцыйнага светапогляду ў жывёлагадоўчай дзейнасці беларусаў (ХХ – пачатак ХХІ ст.) належыць вылучыць наступныя этапы: 1)да 1917 г. – захаванне міфалагічных рыс; 2)1918 – 1990 гады – паступовая трансфармацыя светапогляду беларусаў у кожным новым пакаленні; 3)1991 – 2012 гады – светапогляд беларусаў старэйшага пакалення (60–85-ці гадовы ўзрост) у дачыненні свойскіх жывёл характарызуецца трывалай захаванасцю традыцыйных каштоўнасцяў, жыццёвых прынцыпаў, ідэалаў, рацыянальных ведаў, навыкаў, рытуальна-магічных практык. Найбольш відавочныя змены ў светапоглядзе назіраюцца ў моладзі (да 30 гадоў), якая адмовілася ад утрымання жывёлы ў асабістых гаспадарках. Гэта, натуральна, звужае сферу выкарыстання ведаў, уменняў, навыкаў догляду свойскіх жывёл.

**Спіс літаратуры:**

1. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 6. – Воп. 13. – Адз. зах. 92.
2. Афіцыйны сайт Прэзідэнта РБ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.president.gov.by. – Дата доступа : 12.12.2012 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.] ; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Экоперспектива, 2007. – 613 с.
4. Деревенские мотивы на современный лад [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://pda.sb.by/post/85529/. – Дата доступа 18.04.2012 г.
5. Мид, М. Культура и мир детства / М. Мид. – М. : Наука, 1988. – 429 с.
6. Пименова, К.В. Возрождение и трансформации традиционных верований и практик тувинцев в постсоветский период (основные проблемы) : автореф. …канд. ист. наук / К.В. Пименова. – М., 2007. – 22 с.
7. Портал «Беларусь Сегодня» : Президиум Совмина Беларуси обсудит меры по поддержке и развитию личных подсобных хозяйств [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://sb.by/. – Дата публикации : 29.09.2008.
8. У Беларусі адродзяць развядзенне авечак [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://new.racyja.com/node/26075. – Дата доступа : 24.04.2012.
9. Философский энциклопедический словарь / гл. ред. : Л.Ф. Ильичев, П.Н. Федосеев, С.М. Ковалев, В.Г. Панов. – М. : Сов. энцикл., 1983. – 840 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ